УДК 82-1:811.161.3’373

В.М. Ляшук, дац., канд. філал. навук.
(Каталіцкі ўніверсітэт, г. Ружамберк, Славакія)

# ЛЕКСІЧНЫЯ ІНАВАЦЫІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Сучасная беларуская паэзія мае трывалыя традыцыі ў асобе паэтаў класічнага перыяду (М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас), а таксама прадаўжальнікаў і развівальнікаў паэтычных традыцый. Значны ўплыў на паэзію аказваў і аказвае беларускі фальклор, ўплывы якога маюць разнастайны характар і трансфрамуюцца з эксплікаваных у імплікаваныя формы.

Паэтычны свет аўтара ствараецца арыгінальнай творчай сістэмай вобразнасці, у якую ўключаецца свядомасць сучаснага чалавека. Істотнымі для творчасці і лексічных інавацый выступаюць тэндэцыі сацыяльных і гістарычных змен (рэлігійная лексіка, абазначэнні духоўных і маральных каштоўнасцей і інш.). Гэтыя агульнаграмадскія змены адлюстроўваюць слоўнікі (Слоўнік беларускай мовы. Навук. рэд. А.А. Лукашанец. Мінск: Бел. навука, 2012, скарочана СБМ; Беларускі арфаграфічны слоўнік. Рэд. А.А. Лукашанец. Мінск: Бел навука, 2009, скарочана БАС), яны вобразна інтэрпрэтуюцца і ў паэтычных тэкстах.

Асоба паэта выступае і стваральнікам новых слоў па рэгулярных словаўтваральных мадэлях або пасрэднікам у іх актуалізацыі з дыялектнай сферы. Такая асаблівасць прасочваецца ў тэкстах паэтычнай анталогіі “Дзень паэзіі 2005” (Мінск, 2005; старонкі прыводзяцца па гэтым выданні). Сучасныя слоўнікі адлюстроўваюць іх аднакаранёвыя словы ці словаўтваральныя варыянты: *зімнасць* (Арцюх, З., 7) – *зімна* (СБМ); *нязвычка* (Аўласенка, Г., 8) – *нязвычны* (БАС, СБМ), *нязвычна* (СБМ); *негерой* (Бондар, Т., 25); *завідзь* (м.р. ‘завідкі’ – Галубовіч, Л., 41) – *завідкі* (СБМ); *чарнабыл* і *чарналес* (Гардзей, В., 47) – *чарнобыль* (БАС, СБМ), *чарналессе* (БАС, СБМ); *светастварэнне* (Гаспадыніч, П., 51) – *светаадчуванне, -бачанне, -разуменне, -сузіранне, -успрыманне* (СБМ); М. Мятліцкі: *горычна* (153) – горыч (СБМ), *умоллíва* (155) – *умольна* (СБМ); *шчымотлíва* (155) – *шчымлíва* (СБМ), *юні* (жыцця) (153) – *юнны* (СБМ) і інш.

Актыўна ўтвараюцца дзеясловы: *імклівіць* (Багдановіч, І, 16); *азорыць* (Барысюк, Т., 20) – *азораны* (БАС, СБМ); *леціцца* (‘бываць цёпла, як летам’ – Башлакоў, М., 22); *дзейсніцца* (Дукса, М., 67); *кружляць* (Дукса, М., 68) – кружыць (СБМ).

Лексічныя інавацыі адпавядаюць тэндэнцыям моўнага развіцця і прапануюць натуральныя сродкі, больш дынамічныя і лаканічныя ў параўнанніі з кадыфікаванымі, што звязана як з версалагічнымі, так і з эстэтычнымі і патэнцыяльна кадыфікацыйнымі крытэрыямі.